ГРОДЗЕНСКІ ГАРАДСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

ГРОДЗЕНСКІ ГАРАДСКІ САВЕТ ДЭПУТАТАЎ

ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

ФАКУЛЬТЭТ ГІСТОРЫІ І САЦЫЯЛОГІІ

КАФЕДРА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Репозиторий БарГУ

# ГРОДНА І ГРОДЗЕНЦЫ: ДЗЕВЯЦЬ СТАГОДДЗЯЎ ГІСТОРЫІ (ДА 880-ГОДДЗЯ ГОРАДА)

Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі

Гродна 2008

Пад рэдакцыяй А.І. Антоненкі, А.А. Кавалені, І.П. Крэня

Рэцэнзенты: д-р гіст. навук, праф. У.П. Верхась
д-р гіст. навук, праф. А.М. Нечухрын

Рэдакцыйная калегія:
Антоненка Аляксандр Ільіч – галоўны рэдактар
Крэнь Іван Платонавіч – навуковы рэдактар
Белазаровіч Віктар Аляксандравіч – член рэдкалегіі
Загідулін Аляксей Мікалаевіч – член рэдкалегіі
Сенчанкова Ірына Пятроўна – член рэдкалегіі
Соркіна Іна Валер’еўна – член рэдкалегіі
Коўкель Іван Іванавіч – член рэдкалегіі
Піваварчык Сяргей Аркадз’евіч – член рэдкалегіі

Адказныя за выпуск:
Крэнь І.П., Даніловіч В.В., Дубавец С.У.

Репозиторий БарГУ

аспектах. Усяго два гарады Беларусі могуць ганарыцца тым, што яны зберагалі або і сёння захоўваюць архіўную спадчыну Вялікага княства Літоўскага. Адзін з іх – Гродна.


Літаратура і крыніцы

1. Баніёніс, Э. З гісторыі Літоўскай Метрыкі / Э. Баніёніс // Беларускі гістарычны часопіс. – 1994. – № 1. – С. 18–23.

2. Вяроўкін-Шэлюта, У. Слізні / У. Вяроўкін-Шэлюта // ЭГБ: у 6 т. – Мінск, 2001. – Т. 6, кн. 1. – С. 334 – 335.

3. Галенчанка, Г. Я. Архівы Сапегаў / Г. Я. Галенчанка // ЭГБ: у 6 т. – Мінск, 1993. – Т. 1. – С. 172–173.

4. Галенчанка, Г. Я. Метрыка Вялікага княства Літоўскага / Г. Я. Галенчанка, М. Спірыдонаў // ЭГБ: у 6 т. – Мінск, 1999. – Т. 5. – С. 121 – 128.

5. Горячева, Р. Фамильный фонд помещиков Гродненской губернии Быховцев в Национальном историческом архиве Беларуси в Гродно / Р. Горячева // Архівы і справаводства. – 2008. – № 1. – С. 114–116.

6. Горячева, Р. Фамильный фонд помещиков Гродненской губернии Слізней / Р. Горячева // Архівы і справаводства. – 2007. – № 2. – С. 90–92.

7. Даўгяла, З. Літоўская Метрыка і яе каштоўнасць для вывучэння мінуўшчыны Беларусі / З. Даўгяла // Спадчына. – 1997. – № 4. – С. 85–95.

8. Козловская, Н. Материалы по истории шляхты в фондах Национального исторического архива Беларуси в г. Гродно / Н. Козловская // Архівы і справаводства. – 2001. – № 2. – С. 81–87.

9. Караў, Д. Архіўная спадчына Вялікага княства Літоўскага і беларускія архівы ў канцы XVIII – пач. XX ст. / Д. Караў // Спадчына. – 1996. – № 1. – С. 3–22.

10. Центральный государственный исторический архив Белорусской ССР в гор. Гродно / Путеводитель: сост. Л. В. Аржаева, В. А. Киселёва, Л. П. Панова, Ф. Л. Храброва, Г. А. Шапкина. – Минск, 1965. – 80 с.

11. Чапко, В. У. Быхаўцы / В. У. Чапко // ЭГБ: у 6 т. – Мінск, 1994. – Т. 2. – С. 150–151.

12. Шлюбскі, А. Матэр'ялы да Крыўскае гісторапісі / А. Шлюбскі // Спадчына. – 1992. – № 3. – С. 67–73.

13. Шумейка, М. Вяртанне "Літоўскай Метрыкі": міф ці рэальнасць? / М. Шумейка // Беларуская мінуўшчына. – 1996. – № 2. – С 55–57.

14. Шумейко, М. Ф. Собрать рассеянное. О реституции белорусских архивов в прошлом и настоящем / М. Ф. Шумейко. – Минск: НИИДАД, 1997. – 155 с.



*Літвінскі А.У., г.Баранавічы, БарДУ*


# ГРОДНА І ГРОДЗЕНШЧЫНА Ў ПРАЦАХ ГІСТОРЫКАЎ-ЗАХОДНЕРУСІСТАЎ

Заходнерусізм – уплывовы ў свой час (у другой палове XIX – пачатку XX ст.) накірунак грамадска-палітычнай і навукова-гістарычнай думкі Расіі і Беларусі. Асноўным пастулатам дадзенай ідэалогіі было адмаўленне факта існавання самастойнага беларускага этнасу, за якім заходнерусісты (і то не ўсе) прызнавалі толькі права на існаванне ў якасці субэтнасу ў складзе адзінага рускага народа [12; 7].

Репозиторий БарГУ

Аднак трэба адзначыць, што прыхільнікі заходнерусізму бачылі свайго галоўнага ворага зусім не ў беларускім нацыянальным руху, які бадай што да падзей расійскай рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. быў даволі кволым. Найбольшую антыпатыю выклікала ў іх Польшча, каталіцкая і шляхецкая, паколькі яна прэтэндавала на ўладу над землямі Беларусі, Літвы і Украіны. Ды і рух за беларускае нацыянальнае адраджэнне яны лічылі ўсяго толькі «польскай інтрыгай».

Гістарычную навуку заходнерусісты разглядалі перш-наперш у якасці сродка ідэйна-палітычнай барацьбы, хаця і апелявалі да гістарычнай ісціны [12; 18]. Навукоўцамі, якія належалі да дадзенай гістарыяграфічнай школы, кіравала імкненне даказаць, што беларускія землі, Беларусі ніколі не з'яўляліся польскімі, а знаходжанне іх у складзе Рэчы Паспалітай – трагічны і бясплённы перыяд у мінулым «Западной России».

Вынікі даследаванняў ў галіне краязнаўства прадстаўнікі разгляданага накірунку выкарыстоўвалі ў якасці зброі для паспяховай антыпольскай барацьбы. Сапраўды, лягчэй было даказаць, што гэты край не ёсць польскі і ніколі не быў ім, абапіраючыся не на абстрактныя разважанні агульнага характару, а на багаты мясцовы матэрыял, які сведчыў аб адрозненнях у гістарычным жыцці паміж Беларуссю і Польшчай.

У дадзеным кантэксце асаблівую ўвагу заходнерусістаў прыцягвала тэрыторыя і гісторыя Гродзеншчыны. І справа была не толькі ў тым, что многія з іх былі адсюль родам (хаця і ў гэтым, безумоўна, таксама). Была, на наш погляд, яшчэ больш важкая прычына цікавіцца мінулым гэтага рэгіёна. Маецца на ўвазе ягонае памежнае з Польшчай становішча. Зразумела, што і польска-каталіцкі ўплыў тут адчуваўся значна мацней, чым, прынамсі, ва Усходняй Беларусі. А паколькі з апошнім неабходна было змагацца, то і ўзнікла патрэба ў вывучэнні гістарычных і іншых асаблівасцей Гродзеншчыны, у там ліку і Гродна.

Трэба аддаць належнае гісторыкам-заходнерусістам – яны ўнеслі значны ўклад у развіццё беларускага краязнаўства. Можна з упэўненасцю канстатаваць факт лідэрства разгляданай гістарыяграфічнай школы ў дадзенай галіне ў другой палове XIX – пачатку XX ст. [7; 425 – 432].

Сярод краязнаўцаў другой паловы XIX ст., якія шмат зрабілі для вывучэння гісторыі Гродна і Гродзеншчыны, у першую чаргу неабходна назваць імя П.В. Баброўскага, прадстаўніка памяркоўнай плыні ў заходнерусізме, асобу, якая вылучалася living рознабаковымі інтарэсамі і здольнасцямі. Мабыць, варта было б перавыдаць ягоную «Гродзенскую губерню…»– комплексную, фундаментальную, надзвычай змястоўную і, на нашу думку, вельмі цікавую працу па рэгіянальнай гісторыі, фізічнай і эканамічнай геаграфіі, дэмаграфіі, фальклярыстыцы і этнаграфіі [2]. Навуковая добрасумленнасць аўтара, якой не перашкодзіла пэўная «заходнеруская» тэндэнцыйнасць, дазваляе разглядаць і выкарыстоўваць дадзены твор у якасці каштоўнай гістарычнай крыніцы.

П.В. Баброўскі ў працэсе супрацоўніцтва з даволі-такі адыёзным выданнем «Вестник Западной России» знаёміў сучаснага яму чытача з



Репозиторий БарГУ

гісторыяй асобных гарадоў Гродзенскай губерні. Асабліва хочацца вылучыць краязнаўчы нарыс, у якім разглядалася гісторыя губернскага цэнтра і які мае крыху дзіўную назву «Гістарычная манаграфія г. Гродна» [4]. Нягледзячы на тое, што навуковец, як і ўсе заходнерусісты, ставіў мэтай паказаць адвечную «рускасць» края і гэта надало ягонай рабоце пэўнае адценне суб'ектывізму, усё ж такі трэба падкрэсліць значэнне самога факта папулярызацыі ведаў аб слаўным беларускім горадзе. Гісторык таксама стаў аўтарам кароткіх краязнаўчых нарысаў пра іншыя мясціны Гродзенскай губерні (гл. напр., [1] і [3]).

Я.Ф. Арлоўскі з'яўляўся прадстаўніком наступнага пакалення гісторыкаў-заходнерусістаў. Актыўны супрацоўнік Паўночна-Заходняга аддзела Рускага геаграфічнага таварыства і Гродзенскага царкоўна-археалагічнага камітэта, ён у якасці галоўнага аб'екта сваёй навукова-гістарычнай дзейнасці разглядаў мінулае г. Гродна [7; 428 – 430; 13; 229 – 230]. У гэтым накірунку гісторык і педагог прайшоў шлях ад «Нарысу гісторыі горада Гродна…» [9] да грунтоўнай «Гродзенскай старыны…» [8].

У гэтых працах, у прыватнасці, у «Гродзенскай старыне…» даследчык прымяніў традыцыйны для заходнерусісцкай гістарыяграфіі падыход: канкрэтна-гістарычная інфармацыя пра Гродна спалучаецца ў іх з канцэптуальнымі высновамі аўтара ва ўласцівым для прыхільнікаў дадзенай ідэалогіі духу. Тэзіс аб заганнасці і шкоднасці польска-каталіцкага ўплыву на гісторыю края Я.Ф. Арлоўскі паўтарае неаднакроць. Аднак багаты фактычны матэрыял, змешчаны ў выданні, робіць «Гродзенскую старыну…» цікавай і змястоўнай працай нават для нашых сучаснікаў. Таму неабходна патрымаць ужо выказаную прапанову аб перавыданні кнігі [7; 430]. Для гэтага ёсць нават фармальная падстава – набліжаецца 100-годдзе са дня выхаду яе ў свет.

Не абмінуў Я.Ф. Арлоўскі сваёй навуковай увагай і такое сціплае на той час мястэчка, як Свіслач-Ваўкавыская, гісторыі якога ён прысвяціў спецыяльны нарыс [10].

У пэўным сэнсе адметнай ад згаданых вышэй работ з'яўляецца прысвечаная гісторыі Гродзеншчыны праца Л.М. Саланевіча «Кароткі гістарычны нарыс Гродзенскай губерні за 100 гадоў яе існавання, 1802 – 1902» [11]. Ён у пачатку XX ст. фактычна прэтэндаваў на ролю ідэйнага і палітычнага лідэра заходнерусісцкага руху і ў пэўнай ступені яе выконваў.

Даследаванне мае выразна канцэптуальны і ў значна меншай ступені краязнаўчы характар. Гісторыя зямель, што склалі тэрыторыю Гродзенскай губерні, разглядаецца ў дадзенай працы як своеасаблівая праекцыя гісторыі ўсёй Беларусі на канкрэтны рэгіён края.

Уласна кажучы, нічога новага ў гістарычнай навуцы Л.М. Саланевіч не адкрыў, ды і не збіраўся гэтага рабіць. Ён проста паўтарыў тое, што ўжо было сказана М.В. Каяловічам і іншымі прыхільнікамі заходнерусісцкай канцэпцыі гісторыі Беларусі. Тэзісы Л.М. Саланевіча зводзіліся да наступнага: край гэты (Гродзеншчына, а ў шырэйшым сэнсе слова – і ўся Беларусь) – спрадвечна-рускі, усё зло для яго – ад Польшчы і «лацінства», далучэнне Беларусі да Расіі мела станоўчае значэнне [11; 5 – 11, 14 – 16, 32]. Такім чынам, ён

Рэпазіторый БарДУ

зарэкамендаваў сябе ў якасці аднаго з прапагандыстаў і папулярызатараў гістарычных ведаў, для якіх было недаступнае ўяўленне пра гісторыю як пра складаны, супярэчлівы і неадназначны працэс. Усё гэта істотна зніжае навуковы ўзровень дадзенай работы.

Што да гісторыі Гродна, то тут варта адзначыць факт даволі высокай ацэнкі Л.М. Саланевічам эканамічнай рэформы вядомага гаспадарчага дзеяча апошняга перыяду існавання Рэчы Паспалітай А. Тызенгаўза [11; 40 – 41]. Але ў цэлым праца ўтрымлівае менш звестак пра горад, чым можна было чакаць ад даследавання.

Таікм чынам, гісторыкі-заходнерусісты ўнеслі пэўны ўклад у вывучэнне гісторыі Гродна і Гродзеншчыны. Не засталіся па-за ўвагай і актуальныя для іх пытанні жыцця рэгіёна. Нягледзячы на ідэалагічна абумоўлены суб'ектывізм іх навукова-гістарычных поглядаў, працы, што выйшлі з-пад іх пяра, асабліва працы П.В. Баброўскага і Я.Ф. Арлоўскага, змяшчаюць багаты фактычны матэрыял. Які можна выкарыстоўваць у краязнаўчай рабоце.

Літаратура і крыніцы

1. *Бобровский, П. О.* Брест-Литовский / П. О. Бобровский // Вестник Западной России. – 1867. – Кн. XI. – С. 63.
2. *Бобровский, П. О.* Гродненская губерния. / Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба /. – Ч. 1 – 2 / П. О. Бобровский – СПб., 1863. – 886 с. – 1074 с.
3. *Бобровский, П. О.* Г. Слоним і примечательные места Слонимского уезда / П. О. Бобровский // Вестник Западной России – 1866 – Т. 4 – № 12 – июнь – отд. 2 – С. 161 – 179.
4. *Бобровский, П. О.* Историческая монография г. Гродно / П. О. Бобровский // Вестник Западной России – 1866 – Т. 3 – № 7 – январь – отд. 2 – С. 28 – 43.
5. *Карев, Д. В.* Белорусская и украинская историография конца XVIII – начала 20-х гг. XX в. в процессе генезиса и развития национального исторического сознания белорусов и украинцев / Д. В. Карев. – Вильнюс: ЕГУ, 2007. – 312 с.
6. *Каханоўскі, Г. А.* Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. / Г.А. Каханоўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, – 1984. – 116 с.
7. *Нечухрин, А. Н.* Историки Западной Беларуси XIX – начала XX в. // Наш Радавод. – Кн. 5. – Частка 1. / А. Н. Нечухрин. – Гродна, 1993. – С. 394 – 442.
8. *Орловский, Е. Ф.* Гродненская старина. – Ч. 1. Город Гродно / Е.Ф. Орловский. – Гродно, 1910. – 344 с.
9. *Орловский, Е. Ф.* Очерк истории города Гродно, составленный на основании печатных источников / Е. Ф. Орловский. – Гродно, 1889. – 78 с.
10. *Орловский, Е. Ф.* Свислочь-Волковысская. (Ист. очерк) / Е. Ф. Орловский. – Гродно, 1895. – 40 с.
11. *Солоневич, Л. М.* Краткий исторический очерк Гродненской губернии за сто лет её существования, 1802 – 1902. / Л. М. Солоневич. – Гродно, 1901. – 106 с.
12. *Цьвікевіч, А.* "Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цьвікевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.
13. *Черепица, В. Н.* Михаил Осипович Коялович. История жизни и творчества / В. Н. Черепица. – Гродно: ГрГУ, 1998. – 328 с.
14. *Щербицкий, О. В.* Город Брест-Литовский. Исторический очерк. / О. В. Щербицкий. – Вильна, 1913.– 48 с.

Репозиторий БарГУ